13. Федорец, Я.В. Натюрморт в белорусской живописи 1930-х гг. / Я.В. Федорец // Дзяржава і творчая асоба : матэрыялы XIII рэсп. нав.-практ. канф., Мінск 15 крас. 2022 // Бел. Дзярж. Акад. мастацтваў ; рэдкал.: С.П. Вінакурава [і інш.]. : – Мінск, 2022. – С. 90–94.
14. Федорец, Я.В. Становление и развитие натюрморта в белорусской живописи первой половины XX века / Я.В. Федорец // Искусство и культура. – 2021. – №3 (43). – С. 13–17.
15. Шатских, А.С. Витебск. Жизнь искусства, 1917–1922 / А.С. Шатских. – М. : Яз.рус. Культуры, 2001. – 255 с.
16. Czerwonnaja, S. Неизвестная страница в истории послевоенной художественной эмиграции: Творческая судьба белорусского художника М. Пашкевича. / S. Czerwonnaja // ArchiwumEmigracji. – 2013. – № 1 (18). – s. 143–155.

## МАСТАК УЛАДЗІМІР КОЗІН:
## ТВОРЧЫ ШЛЯХ ЛЯЖАЎ ПРАЗ ВІЦЕБСК

М.Л. Цыбульскі (Віцебск)

17 верасня 2022 года, у выставачнай зале Саюза мастакоў Латвіі са стагадовым юбілеем віншавалі найстарэйшага мастака Латвіі, заслужанага дзеяча мастацтваў Латвійскай ССР (1978), прафесара Латвійскай акадэміі мастацтваў Уладзіміра Козіна. Галоўнай падзеяй урачыстасці, безумоўна, стала адкрыццё яго персанальнай выставы. На жаль, з Віцебску на гэтай імпрэзе не было нікога і узгадаць пра Віцебскую мастацкую вучэльню, праз якую ў свой час прайшоў Козін, не было каму...

“Усе падзеі таго часу добра захаваліся ў памяці,” – пачаў нашу сустрэчу Уладзімір Козін у маі 2018 года ў майстэрні, дзе ён вёў чарговыя занняткі са студыйцамі. Спатканне ў Рызе, арганізаванае В. Целешам, мела на мэце не толькі інтэрв’юіраванне мастака, але і далейшую падрыхтоўку яго выставы ў Віцебску. Мастак не толькі адразу даў згоду арганізаваць сваю персанальную выставу ў Беларусі, але і паабяцаў падараваць Віцебскаму мастацкаму музею шэраг сваіх жывапісных твораў. Па розных прычынах паўнамаштабнай выставы У. Козіна ў тым годзе не атрымалася, але перададзеныя ім у дар Віцебску праз консула Латвійскай Рэспублікі Угіса Скую семь жывапісных палотнаў на некалькі тыдняў годна прадставілі творчасць Уладзіміра Козіна ў адным з залаў абласнога музея.

*Мэта дадзенага артыкула* – рэканструяваць віцебскі этап у творчай біяграфіі Уладзіміра Козіна і прааналізаваць жыццёвы і творчы шлях мастака.

Уладзімір Козін нарадзіўся 17 верасня 1922 года ў сялянскай сям’і ў вёсцы Левенка Старадубскага павета Гомельскай губерні (цяпер –

Бранская вобласць РФ) [1]. “Жыла наша сям’ï нядрэнна, хата з бярвення пад жалезным дахам, дашчаная падлога, – узгадваў У. Козін, – але дзяцінства не было бесклапотным. У нас была невялікая гаспадарка, якой апекаваўся мой бацька, але ж працаваць даводзілася ўсім. Калі пачалася калектывізацыя ён не захацеў уступаць у калгас. Як сям'ю аднаасобнікаў-падкулачнікаў нас абклалі цвёрдым падаткам, выплаціць які было фізічна немагчыма. Разумеючы бесперспектыўнасць далейшага жыцця ў вёсцы, бацька з’ехаў працаваць рабочым на вагонабудаўнічы завод “Чырвоны Прафінтэрн” у г. Бежыца. Цяпер гэта раён Бранска. Хутка і мы з мамай, а таксама двума маімі старэйшымі братамі – Міхаілам і Аляксандрам – адправіліся туды”[1].

У той час Уладзімір паспеў скончыць чатыры класы вясковай школы. У пяты клас ён пайшоў ужо ў горадзе Бежыца. Там быў Дом піянераў, дзе У. Козін у гуртку скульптуры не толькі ўпершыню сур’ёзна дакрануўся да мастацтва, але і атрымаў “пачатковую мастацкую адукацыю”, як сцвярджае мастак. Кіраўніком гуртка была мастачка Зінаіда Паўлаўна Мэер. “Яна была з дарэвалюцыйных інтэлігентаў. Некалі вучылася ў Харкаўскім мастацкім інстытуце. Займалася жывапісам, пісала эцюды, малявала... Калі мне пашанцавала трапіць да яе дамоў, то я змог убачыць яе работы аформленыя у рамы і развеўшаныя па сценах”[2].

У скульптурным гуртку У. Козін працаваў з захапленнем і нярэдка дацямна. Здаецца, нішто іншае юнака тады не цікавіла, толькі мастацтва. Пад вялікім уражаннем ад тагачаснага кінематографа, вобразаў першых савецкіх фільмаў – “Чапаеў”, “Браняносец «Пацёмкін»”, “Мы з Кранштата” – юны мастак ляпіў сваіх герояў. “Менавіта ў скульптурным гуртку я ўпершыню зразумеў, што такое мастацкі вобраз, – сцвярджае Козін. Мы вельмі сур’ёзна працавалі над нашымі гераічнымі персанажамі. У мяне нядрэнна атрымліваліся пластычныя вобразы. Пра іх не аднойчы пісала прэса. Да таго ж, за тры гады навучання ў гуртку я даведаўся пра вялікіх мастакоў, убачыў іх творы, бо ў нашага педагога былі альбомы з рэпрадукцыямі з Траццякоўкі. Пасля знаёмства з класічнымі творамі я выляпіў праект фантана “Нетры зямлі”, цэнтральнай фігурай якога зрабіў персанаж у нечым падобны на Самсона, які раздзірае зямны шар. А адтуль б’е падсвечаны фантан. Вось такімі былі хлапечыя фантазіі...”[3].

Натхнёны першым мастацкім вопытам, у 15 гадоў, У. Козін адправіўся паступаць ў Віцебскую мастацкую вучэльню. Паколькі скульптурнага аддзялення там не было, то юнак вырашыў пайсці на аддзяленне жывапісу. Уступныя экзамены сур’ёзным выпрабаваннем не сталі, сказалася папярэдняя падрыхтоўка па малюнку і жывапісу. У гэтым годзеў Віцебскую вучэльню паступілі і вучыліся разам з У. Козіным Віктар

1 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.
2 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.
3 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.

Ткачоў (старэйшы, са славутых братоў Ткачовых), Раіса Кудрэвіч, Аляксандра Паслядовіч, Адольф Гугель, Уладзімір Белавусаў.

“На 1 курсе ў нас выкладаў В. Дзежыц. Ён мне запомніўся. Памятаю я і Ў. Хрусталёва. Мы займаліся на першым паверсе ў вучэбным класе, кавалак якога з адным вакном быў адгароджаны пад асабістую майстэрню гэтага мастака і педагога. Аднойчы ён адчыніў туды дзверы і прапанаваў нам зайсці. Мы разглядалі гэты куток мастака з вялікай цікавасцю. Леў Лейтман выкладаў акварэль.

На старэйшых курсах алейны жывапіс вёў Іван Ахрэмчык. Працу з натуры ён лічыў асноўнай для будучага мастака і надаваў ёй асаблівую ўвагу. Патрабаваў сур’ёзных адносін пры працы над мадэллю. Ахрэмчык звяртаў нашу ўвагу на агульны каларыт, пластыку, казаў і пра больш вольнае ўспрыняцце натуры. Іван Ахрэмчык мог не толькі падказаць, як напісаць той ці іншы фрагмент, але і прадэманстраваць тое, пра што ён гаварыў. У адносінах да нас ён быў даволі стрыманым. Асабліва паважаў здольных студэнтаў, да якіх ставіўся як да роўных. У 1939 годзе, калі Ахрэмчык ужо быў дырэктарам, тэрмін навучання ў вучылішчы быў павялічаны з 4 да 5 гадоў, як нам тлумачылі, каб мець магчымасць больш глыбока і дасканала вывучаць спецыяльныя дысцыпліны. Пасля вайны я двойчы сустракаўся з Іванам Восіпавічам Ахрэмчыкам.

Праграма навучання ў вучэльні была традыцыйная, нічога асаблівага там не было. Займаліся засваеннем малюнку і жывапісу, вучыліся прыстойна маляваць, пісаць форму. У гэты час у Віцебску ніхто нават не заікаўся аб пастаноўцы фармальных задач у мастацтве”.[1]

Уладзіміру Козіну на пачатку жыць у Віцебску было цяжка. Стыпендыя мізэрная, а бацькі асабліва нічым дапамагчы не маглі. У гэты ж час ў інстытуце ў Маскве вучыўся яго брат Міхаіл, якому таксама была патрэбна падтрымка. “Спачатку я жыў у інтэрнаце для дзяўчат і хлопцаў, які знаходзіўся праз вуліцу ад вучэльні ў двухпавярховым будынку. Нас там жыло чалавек 12. Пакоі былі сырыя і не вельмі ўтульныя... 1 курс праляцеў хутка. Сталі прыстасоўвацца і падпрацоўваць – халтурыць. Хадзілі па дзіцячых садах, малявалі зайчыкаў і птушак на сценах – нам плацілі, малявалі лозунгі, плакаты, да святаў шмат працы было. Часам можна было бачыць як да нас на 2 паверх прыходзілі заказчыкі...”[2]

“А потым атрымалі сапраўдны «заказ», які карміў нас да заканчэння вучылішча. Адзін мясцовы габрэй, працаўнік гархарчгандлю, прыдумаў увесці сацспаборніцтва паміж прадуктовымі крамамі. І замовіў нам маляваць бланкі сацдагавораў – з віньеткамі, рамачкамі. Крамаў было шмат, а заказчык быў чалавек прыстойны і плаціў вельмі акуратна. Мы з таварышам забагацелі – знялі пакой і нават купілі гарнітуры!” [2].

1З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.
2З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.

У 1939-м годзе, пасля заканчэння другога курса, У. Козін вырашыў з'ездзіць у Маскву да брата, які ў гэты час быў студэнтам Інстытута філасофіі, літаратуры і гісторыі. Але галоўным пунктам праграмы было, канешне ж, наведванне музеяў. Акрамя Траццякоўскай галерэі ўдалося трапіць і на Ўсесаюзную мастацкую выставу "Індустрыя сацыялізму". "Пабываўшы на ёй, я быў уражаны творамі Іагансана Дэйнекі, Герасімава, Пластава, Піменава... Напэўна, я яшчэ не мог па сапраўднаму ацаніць майстэрства гэтых мастакоў, якасці малюнка ці жывапісу, а вось адчуванне жыцця – гэта мне было зразумела. Таму і захацелася быць падобным на гэтых творцаў. Узнікла жаданне скончыць вучылішча і паехаць паступіць у Акадэмію мастацтваў у Ленінград"[1].

Калі У. Козін быў на чацвёртым курсе ў вучэльні з'явіўся новы настаўнік – Хайнан Самойлавіч Гутэрман (1909–1942), які прыехаў у Віцебск з жонкай і маленькай дачкой пасля заканчэння жывапіснага факультэта Ленінградскага інстытута жывапісу, скульптуры іархітэктуры Усерасійскай Акадэміі мастацтваў. Ён быў вучням славутага рускага мастака А.І. Савінава. Студэнты аднекуль даведаліся, што дыпломнай работай Гутэрманабыла кампазіцыя "Мітынг у габрэйскім калгасе", якую ён выконваў пад кіраўніцтвам Б.У. Іагансона. "Гутэрман вельмі добра выкладаў у нас малюнак. Год заняткаў у яго майстэрні і асновы акадэмічнага малюнка рускай школы былі закладзены. (...) Гутэрман быў параўнальна малады па ўзросце, але лёс яго склаўся вельмі трагічна. Перад вайной у яго памерла жонка. А сам ён будучы ў войску трапіў пад Сталінград, дзе і загінуў. Да гэтага я ад яго атрымаў пару лістоў, дзе Гутэрман пісаў, што "надзеі на жыццё вельмі мала" і прасіў знайсці яго дачку. Але гэта было немагчыма..."[2]

Уладзімір Козін не аднойчы казаў, што Віцебскае мастацкае вучылішча заклала асновы малюнка і жывапісу, хоць мастаком, прафесіяналам ён сябе тады не адчуваў [3]. Мара пра працяг навучання яго не пакідала.

Завяршэнню вучобы ў вучэльні перашкодзіла вайна. Вакзал ужо бамбілі, калі У. Козін не захапіўшы з сабой нават дакументы ўцякаў з Віцебску. На нейкіх платформах удалося дабрацца да Смаленска, які ў гэты час ужо быў у агні. Далей – да бацькоў у Бежыцу.

Адтуль у эвакуацыю ў Краснаярск Уладзімір ехаў ў эшалоне з бацькамі. У Краснаярску на правым беразе Енісея літаральна ў полі працягнулі чыгуначную нітку. Размясцілі там цэхі, зрабілі насцілы, падключылі абсталяванне. Усталявалі пару паравых катлоў электрастанцыі і цэхі сталі працаваць. Рабочыя жылі цяплушках у суседняй вёсцы.

У тым жа ў 1941 годзе; Козін звярнуўся ў ваенкамат. "Мне сказалі: пачакай. У лістападзе выклікалі і далі накіраванне ў артылерыйскае

1 З інтэрв'ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.
2 З інтэрв'ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.

вучылішча. Але ж, я хацеў пайсці салдатам. Адпусцілі... Праз пару тыдняў зноў пазваў ваенкамат: паедзеш у авіяцыйную вучэльню ў горадзе Канску. У лістападзе ўжо пачаліся маразы, калі мы адправіліся ў Канск. Неяк дабраліся да гэтай вучэльні. А там нам кажуць: у нас ёсць цэлы выпуск лётчыкаў – няма матэрыяльнай часткі. І нас накіроўваюць у сібірскую пяхотную дывізію. Асобны батальён сувязі пры штабе дывізіі. Выклікае палітрук і кажа: чаму не камсамолец? Але ж я з раскулачаных! Аказалася, што гэта ўжо не важна. Я стаў камсамольцам, праз нейкі час – намеснікам палітрука тэлефонна кабельнай роты”[1].

“Сувязістам пры прызыве давалі права выбару – адправіцца ў Сталінград або на Паўночны Каўказ, куды ўжо наступалі немцы. Мы з таварышам чамусьці выбралі Каўказ – і гэта нас выратавала. Таму што ў тым жа 42-м пачалася Сталінградская эпапея, дзе была страшная мясарубка [2]. У 1942 годзе У. Козіна накіравалі на Ўкраінскі фронт, дзе замест наступу ён стаў удзельнікам грандыёзнага, большай часткай хаатычнага адступлення, адзін з эпізодаў якога пасля стаў тэмай яго дыпломнай працы ў Латвійскай Акадэміі майстэрстваў. Далей была абарона Паўночнага Каўказа і першая ўзнагарода – медаль. Вайну Козін скончыў у Літве старшым сяржантам, начальнікам групы шыфравальшчыкаў, а службу ў арміі працягнуў у Рызе [4]. У Рызе Козін трапіў у зусім іншую дывізію, стаў там старшым сяржантам. Пазней яго адправілі ў штаб дывізіі, дзе ён стаў спачатку чарцёжнікам, а потым шыфравальшчыкам.

Знаходзячыся ў Рызе, Уладзімір Козін даведаўся, што тут ёсць Акадэмія мастацтваў і вырашыў пацікавіцца, як туды трапіць вольным слухачом. Прыйшоў да рэктара і папрасіў дазволу наведваць заняткі. Але пад час сустрэчы рэктар акадэміі Ота Скулмэ прапанаваў адразу залічыць Козіна на трэці курс. “Аказалася што мой узровень падрыхтоўкі адпавядае 3 курсу! І мяне пасалалі ў групу, дзе вучыліся два студэнты якія размаўлялі па-руску. Так у мяне ў адной кішэні аказаўся студэнцкі білет, у другой – салдацкая кніжка.

Я добра памятаю, як я першы раз прыйшоў у майстэрню малюнка. Студэнты малявалі аголеную мадэль. Для мяне пасля чатырох гадоў перапынку гэта было не проста...”[2]

Уладзіміру Козіну давялося ўжывацца ў новую атмасферу, пераглядаць некаторыя ўжо склаўшыеся ўяўленні пра жывапіс, ролю колеру. Да таго ж Козін выбраў для сябе навучанне ў майстэрні станковага жывапісу прафесара Гедэрта Эліяса. Той лічыўся аўтарытэтам па частцы кампазіцыі, дысцыпліне якая яшчэ ў віцебскай вучэльні асабліва прыцягвала Козіна і па якой ў яго заўсёды былі пяцёркі.

---

1 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс  май 2018 года.
2 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс  май 2018 года.

Чарговая сустрэча У. Козіна з Віцебскам адбылася ў 1947 годзе. “Я паехаў на радзіму ў вёску Левенка, дзе заставалася жыць мая сястра. На адваротным шляху, вырашыў што абавязкова наведаю Віцебск. Але калі цягнік прыпыніўся і я апынуўся на віцебскай платформе мяне шакіравала тое, што я ўбачыў: замест цэнтральнай вуліцы, што была перад вакзалам была груда камянёў... І я паехаў далей...”[1].

Пасля заканчэння Латвійскай Акадэміі мастацтваў ў 1949 годзе Козін планаваў паступаць у аспірантуру Акадэміі мастацтваў у Ленінград. Але О. Скулме ўгаварыў яго застацца ў alma mater выкладчыкам. І накіраваў працаваць на кафедру жывапісу і кампазіцыі.

На працягу 50 гадоў (1949–1989) У. Козін выкладаў у Латвійскай Акадэміі мастацтваў жывапіс. Спачатку ён быў асістэнтам К. Міеснiекса. Калі загадчыкам кафедры быў Тылберг Козін быў яго памочнікам: вёў дакументацыю, складаў планы і інш. У 1953 годзе ён становіцца загадчыкам кафедры жывапісу і кампазіцыі, дацэнтам (1953). Праз дзесяць год ён атрымае званне прафесара (1963).

З 1949 года Козін удзельнічае ў рэспубліканскіх выставах, з 1955 – ва ўсесаюзных. Яго персанальныя выставы адбыліся ў Гулбенскім гісторыка-мастацкім музеі (1982) і Лапмежцыемсе (1985), у Рызе – у мастацкай галерэі “Нелія” (2002, 2004, 2005); рэтраспектыўныя выставы ў музеі “Арсенал” (2009), галерэі Рыжская выставачная прастора (2010), у галерэі Саюзамастакоў Латвіі (2012, 2017, 2022), у цэнтры Joker Klubs (2014), у галерэі класічнага мастацтва Antonija (2017), у мастацкай галерэі Rietumu (2019), ў Бранскім мастацкім музеі (2020). У. Козін удзельнічаў у выставах у Латвіі, Германіі, Японіі, Расіі, Узбекістане і інш.

Член Саюза мастакоў Латвіі з 1950 года, У. Козін быў старшынёй секцыі жывапісцаў, старшынёй рэвізійнай камісіі, старшынёй бюро секцыі мастакоў-ветэранаў вайны.

Уладзімір Козін – пераканаы прыхільнік рэалістычнага накірунку ў жывапісе. На працягу творчасці яго манера жывапісу перажывала змены, але нязменнай заставаліся вернасць натуры. Злучыўшы у сваёй творчасці традыцыі рускай мастацкай школы і латышскага танальнага жывапісу [5], мастак працаваў практычна ва ўсіх жанрах. Ён майстар буйнафарматных фігуратыўных кампазіцый і псіхалагічнага партрэта, лірычнага пейзажа і метафізічнага нацюрморта.

Козін перакананы: мастак павінен адлюстроўваць свой час. І таму ў сваёй творчасці ён адгукаўся на розныя актуальныя тэмы, маштабныя грамадскія падзеі. “Самыя вялікія хвіліны хвалявання я адчуваў толькі ў адным выпадку. Калі пісаў тэматычныя карціны, (...) Я адчуваў асалоду і задавальненне ад самага творчага працэсу...” [6].

1 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс  май 2018 года.

Да віцебскага ж перыяду адносіцца і захапленне У. Козіна гісторыяй [3]. Па ваенных уражаннях ім напісаны эскіз "Згон жывёлы ў тыл" (1948), яго дыпломная праца "Гурты на дарогах" (1949), якую Козін з поспехам абараніў ў Латвійскай акадэміі мастацтваў. Але ў выказваннях мастака на ваенную тэму не ўбачыш батальных эфектаў. "Вайна для мяне – гэта не толькі форма знішчэння і калечэння людзей. Гэта калечэнне чалавечых душ. Так я бачу вайну і так яе адлюстроўваю. У маёй працы "Ідуць баі" (1985) увогуле няма героя, няма масавых сцэн, няма крыкаў "ура!", а ёсць бясконцае ахвярапрынашэнне" [3]. Да тэмы мінулай вайны мастак звяртаўся неаднаразова, ствараючы выразныя сімвалічныя вобразы (трыпціх "Да жыцця" (1974), у які уваходзяць кампазіцыі "Перамога" і "Выжыў!"; кампазіцыі "Ночы без сна" (1975), "Бой", "Палёт", "Белыя птушкі", "Дні і ночы" (1982) і інш.). Вялікую ролю ў падобных кампазіцыях адыгрывае пейзаж. Магчыма таму яны носяць жыццесцвярджальны характар.

Як прызнаваўся У. Козін, ён "са студэнцкіх гадоў зразумеў, што ў аснове карціны павінен быць канфлікт, не абавязкова літаратурны, але выяўленчы – абавязкова [3]. А таму імкненне да тэматызму і апавядальнасці ў яго творчасці, здаецца, вядучыя. Тэматычныя, палотны Козіна глыбока сімвалічныя, некаторым з іх уласцівы рамантычныя настроі ("Першы працадзень", "Пасадзілі дрэва"). Многія жанравыя шматфігурныя кампазіцыі пісаліся пасля вяртання Козіна з паездак па краіне.

Але як асоба У. Козін паўней адкрываецца ў інтымных па гучанні працах малога фармату. Да і сам мастак дапускае, што яго талент і майстэрства жывапісца больш поўна праявілі сябе менавіта ў камерных жанрах – пейзажы і нацюрморце. У іх свабода, мажорная танальнасць пачуццяў, гучнасць палітры.

Пейзаж у Козіна рэдка абыходзіцца без прысутнасці чалавека. Настрой пейзажаў амаль заўсёды прыўзняты. "Я шмат пісаў на пленэры. Але ўсё ж, нягледзячы налюбоў да імпрэсіяністаў, застаюся прыхільнікам рускай школы пейзажа, якая надае шмат увагі настрою і выражэнню зместу праз ландшафт, а не проста рашэнню задач паветранай перспектывы" [3]. Нацюрморты займаюць значнае, магчыма, цэнтральнае месца ў творчасці мастака. У многіх з іх можна ўбачыць палявыя кветкі.

Козін пісаў вядомых дзеячаў латышскай культуры (партрэт акцёра К. Клетніекса (1950), стварыў партрэты мастакоў (Г. Эліяса, (1979), Л. Свемпса (1978 і 1979), М. Брэйкшса (1980), Э. Ілтнера (1987), І. Зарыньша (1977). Цікавыя і аўтапартрэты самога майстра, партрэт бацькі (Партрэт бацькі (1982). На апошніх палотнах ён часта піша жонку – Ніну Аляксандраўну, якая пайшла з жыцця ў 2019 годзе ("Усё пад Богам ходзім").

**Заключэнне.** "Усё ў маім жыцці было нібы то прадвызначана загадзя, – падкрэслівае мастак. Мне здаецца, што я спецыяльна ніякіх дзеянняў не

прэдпрымаў”[1]. Так, ці інакш, “мастак з рускімі каранямі, Уладзімір Козін у латвійскім мастацтве прадстаўляе цэлую эпоху” [7]. Больш за 30 работ Козіна знаходзіцца ў зборы Латвійскага нацыянальнага мастацкага музея, 31 праца – у зборы Бранскага мастацкага музея. Работы майстра ёсць таксама ў фондах Саюза мастакоў Латвіі, Мастацкага музея Віцебска, Латгальскага культурна-гістарычнага музея ў Рэзекне, Елгаўскага музея гісторыі і мастацтва, рыжскай галерэі класічнага мастацтва Antonija, нямала карцін захоўваецца ў прыватных калекцыях у Латвіі і за яе межамі.

Нягледзячы на ўзрост, У. Козін і сёння працягвае пісаць. Новыя творы можна ўбачыць у альбоме, што быў падрыхтаванынапярэдадні яго юбілею [8]. На жаль твораў віцебскага перыяду немагчыма пабачыць ні ў манаграфіі 2020 (VladimirsKozins. Glezniecība. Rīga, 2020. 208 lpp.), ні ў альбоме 2021 года (VladimirsKozins. Zīmēšana. Glezniecība. Grafika. Rīga. 2021. 172 lpp.). Усё, над чым Козін працаваў у тыя гады, згарэла ў пажары Вялікай Айчыннай вайны.

Сведка цэлай эпохі Уладзімір Козін,разважаючы пра творчасць падкрэслівае: “Свабодатворчасці залежыць толькі ад сілы таленту. Ёсць адзінкі мастакоў, якія здольныя да наватарства. Вось тыя вольныя” [9]. Але самае вялікае задавальненне, “кайф” ад творчай працы, атрымліваеш калі вымотваеш сябе і па часе, і па сілах, жадаючы сказаць нешта важнае сваім гледачам”.[2]

*Крыніцы і літаратура:*


1. Малнач А. Владимир Козин // http://www.russkije.lv/ru/lib/read/vladimir-kozin.html
2. Лебедева Н. «Всегда старался найти звучащий нерв…»// Вести Сегодня 31 августа 2012 (№ 129)
3. Малнач А.Воплощение мечты: 100 лет латвийскому художнику Владимиру Козину //http://www.russkije.lv/files/images/text/Malnach/ Kozin_ 100.pdf
4. Малнач А.Владимир Козин: Картинки с выставки// http://www.russkije.lv/ru/journalism/read/malnach-kozin/
5. VladimirsKozins. Glezniecība. Rīga, 2020.-lpp. 20
6. Козин: из искусства изгнано содержание // http://dev.itd.lv/rus/kultura/kozin-iz-iskusstva-izgnano-soderzhanie/
7. Спаритис О. Приветствие из молодости // VladimirsKozins. Glezniecība. Rīga, 2020. С. 28–31. ].
8. Вышла в свет монография старейшего художника Латвии Козина // https://lv.sputniknews.ru/20220114/vyshla-v-svet-monografiya-stareyshego-khudozhnika-latvii-kozina-20014879.html
9. Малнач А.Неповерженный // http://www.russkije.lv/ru/journalism/read/malnach- kozin-1/


1 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.
2 З інтэрв’ю аўтара артыкула з У. Козіным. Запіс май 2018 года.